# Ад радактара

У гістарычнай навуцы на сенняшні дзень востра стаіць праблема аб’ектыўнасці гістарычных ведаў пры субектыўнасці крыніц дадзеных ведаў.
Канешне, існуюць дакументы, якія ў той ці іншай ступені пазбаўлены суб’ектывізма (матэрыялы юрыспрудэнцыі, гаспадарчыя дакументы), аднак яны, на жаль, дазваляюць зразумець толькі некаторую спецыфічную частку жыцця, да якой некалі адносіліся. Ад мікенскіх палацаў засталіся вялізныя архівы, але яны прысвечаны толькі гаспадарчай дзейнасці палацаў. Таму мы можам сказаць вельмі мала аб палітычных узаемаадносінах паміж палацамі, аб вераванных іх жыхароў і аб іншых сферах жыцця. Нам вядома толькі якія і за кошт працы каго атрымлівалі ураджаі. Прыадхінуць пакроў дазваляе археалогія. Аднак інтэрпрэтацыя знойдзенных артэфактаў асобная праблема гістарычнай навукі. Як сказала амерыканская даследчыца Е. Вандайвер: калі каталіцтва застануцца толькі матэрыяльныя сведчанні, гісторыкі будучага, сыходзячы з шматлікіх выяў панны Марыі, могуць вырашыць, што каталіцтва – гэта культ Багіні-Маці. Гісторык не можа абмежавацца толькі археалагічнымі знаходкамі, ён усе адно звяртаецца да крыніц, па вызначэнню суб’ектыўных.
Пакаленні гісторыкаў прызнавалі, што з суб’ектыўнасцю крыніц нічога нельга зрабіць, таму суб’етыўны і атрыманныя вынікі, але па іншаму працаваць немагчыма. Пазней многія вырашылі, што зыходзячы з агульнай канцэпцыі гістарычнага развіцця можна высветліць матывы аўтараў крыніц і ключавых гістарычных дзеячоў і таму даведацца як усе было на самой справе. Ісціна, што атрымлівалася моцна залежыла ад канцэпцыі, якой карыстаўся навуковец. Для адных гісторыя была барацьбой арыйскага этнічнага элемента з неарыйскім, для іншых – барацьбой прыгнечанага працоўнага насельніцтва за лепшае жыцце. Перабольшанная ў анекдотах, такая пазіцыя прыводзіла да камічных тэзісаў кшталту “Старажытнарымскія рабы хадзілі на мітынгі пад лозунгам “Няхай жыве феадалізм – светлая будучыня ўсяго чалавецтва!”
У дадзеным зборніку апублікаваны чарговыя спробы навукоўцаў, часам і пачынаючых, распавесці аб гістарычнай рэчаіснасці, абыйшоўшы суб’ектыўнась і крыніц, і сваю ўласную.